Belarus live

**Newsletter**
4.12.2006

## Тыдзень у фактах

23 лістапада Аляксандар Лукашэнка правёў вялікую прэсавую канфэрэнцыю для ўкраінскіх журналістаў. Ён прапанаваў Кіеву шчыльную супрацу ў энэргетычных пытаньнях. І нават пайшоў далей, паразважаўшы аб пэрспэктывах стварэньня саюзнай дзяржавы з Украінай.

Аналітыкі вылучылі як ключавую думку Лукашэнкі пра тое, што такі альянс прымусіў бы з сабой лічыцца. Маўляў, ягонае геапалітычнае месцазнаходжаньне ёсьць „горлам Расеі і Заходняй Эўропы". Незалежныя камэнтатары адзначылі так-сама, што прэсавая канфэрэнцыя стала элемэнтам псыхалягічнага ціску на Крэмль у зьвязку з вострай двухбаковай спрэчкай у нафтагазавых пытаньнях.

Чакалася, што пэўныя акцэнты ў ёй расставіць сустрэча беларускага і расейскага прэзыдэнтаў падчас саміту лідэраў СНД у Менску 28 лістапада (само мерапрыемства ў межах Садружнасьці незалежныя назіральнікі назвалі „пустым” і „правальным").

У выніку пра зьмест дыялёгу сам-насам між лідэрамі Беларусі і Расеі практычна нічога афіцыйна не паведамілі.

Няма пакуль пэўнасьці і ў пытаньні пра незалежную ацэнку беларускага „Белтрансгазу” (акцыі якога даўно хача купіць расейскі „Газпром") галяндзкім банкам ABN Amro.

Разам з тым, перад адлётам у Маскву з саміту Уладзімер Пуцін зрабіў заяву, што на базе „Белтрансгазу” неўзабаве будзе створана сумеснае прадпрыемства на парытэтных падставах. Назіральнікі лічаць гэтую заяву спробай псыхалягічнага ўзьдзеяньня на беларускага партнэра. Апошні, на іх думку, усяляк адбіваецца ад продажу газатранспартнай сыстэмы. Збольшага экспэрты лічаць, што вызначальныя раўнды перамоваў у пытаньнях энэрганосьбітаў яшчэ наперадзе.


### АФІЦЫЙНА

- Фармаваньне выбарчых камісіяў завершанае

### АПАЗЫЦЫЯ

- А. Мілінкевіч у Рызе
- А. Мілінкевіч сустрэўся з прэзыдэнтам ЗША

### ЭКАНОМІКА

- Беларусь і Расея да канца году створаць супольны газавы канцэрн
- Расейскі газ для Беларусі па 200 даляраў!?

### ГРАМАДЗТВА

- Коласаўцы вучацца ля Ўроцлава
- У Менску адбылася цырымонія ўручэньня кардыналу Казіміру Сьвёнтку адзнакаў Камандора Ордэна Ганаровага Легіёну

### КУЛЬТУРА

- Юбілей „Нашай Нівы"
- 80-годзьдзе Драматычнага тэатру імя Я. Коласа

У прыватнасьці, Расея і Беларусь не змаглі, як плянавалася, парафіраваць 24 лістапада праект пагадненьня адносна разьмеркаваньня экспартных мытаў на нафтапрадукты.

Рэч у тым, што, звыш рэзкага падвышэньня коштаў на газ (да $200-230 за тысячу кубамэтраў), Масква плянуе скараціць так званую нафтавую рэнту (паводле некаторых падлікаў, беларускі бюджэт атрымлівае за год да $4-5 мільярдаў за кошт выгаднага продажу на Захад прадуктаў перапрацоўкі расейскай нафты). Экспэрты лічаць малаімаверным варыянт адключэньня паставак газу для Беларусі з 1 студзеня (чым нядаўна палохаў прадстаўнік „Газпрома").

Прагназуецца цэнавы кампраміс ($100-150 за тысячу кубамэтраў „блакітнага паліва") за кошт саступак беларускага боку ў пытаньні продажу часткі актываў „Белтрансгазу". Масква таксама пэўна возьме пад увагу каштоўнасьць Беларусі як транзытнага калідору і вайскова-стратэгічнага партнэра, піша незалежная прэса.

Наглядальнікі падкрэсьліваюць, што ў пошуках энэргетычных альтэрнатываў Менск шукае новых партнэраў. Так, 28 лістапада, у дзень саміту СНД, адбылася сустрэча беларускага прэзыдэнта з украінскім і азэрбайджанскім калегамі на тэму супрацоўніцтва ў энэргетычнай галіне.

У той самы дзень адзін зь лідэраў беларускай апазыцыі Аляксандар Мілінкевіч сустрэўся ў Рызе з прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам падчас саміту NATO. Па вяртаньні у Менск ён быў абвінавачаны ў незаконным перасячэньні мяжы і неўзабаве можа быць асуджаны.

Тым часам прадстаўнікі дэмакратычнага лягеру выказваюць меркаваньне, што працягваецца перасьлед колішніх дзеячаў апазыцыі ў парлямэнце. Яшчэ адзін сябра былой дэпутацкай групы „Рэспубліка" — Генадзь Дылеўскі — асуджаны на пяць гадоў за тое, што нібыта падбухторваў да даваньня хабару. Пра гэта паведаміў 29 лістапада генэральны пракурор Беларусі.

Між тым доўжыцца распачатая 20 кастрычніка галадоўка Аляксандра Казуліна, апазыцыйнага экс-кандыдата на мінулых прэзыдэнцкіх выбарах, зняволенага затым на пяць з паловай гадоў. Ягоны стан крытычны.

Лідэры апазыцыйных партыяў заклікалі Казуліна спыніць галадоўку на той падставе, што часткова ягоныя патрабаваньні выкананыя. Аднак Казулін вылучае як галоўную ўмову, каб „беларускае пытаньне" разгледзела Рада бясьпекі ААН. Разам з тым шараговае насельніцтва мала інфармаванае пра галадоўку. Яшчэ болей, паводле зьвестак незалежных сацыёлягаў з НІСЭПД (Вільня), 44% беларусаў увогуле ня ведаюць, што былы кандыдат у прэзыдэнты трапіў за краты.

Пытаньне наладжваньня камунікацыяў з насельніцтвам аб'яднаныя дэмакратычныя сілы (АДС) спрабуюць вырашыць падчас кампаніі мясцовых выбараў, прызначаных на 14 студзеня 2007 году.

Паралельна апазыцыя рыхтуе 2-і Кангрэс дэмакратычных сілаў і „гарачую вясну". Мяркуецца, што пратэставыя настроі масаў можа каталізаваць пагаршэньне эканамічнага становішча ў зьвязку з ростам кошту энэрганосьбітаў. Але афіцыйная прапаганда абвінавачвае праціўнікаў рэжыму ў жаданьні „пагрэць рукі на бедах народу".

Выклікае крытыку і сама ідэя 2-га Кангрэсу дэмакратычных сілаў. Днямі сярод часткі апазыцыйнага актыву распачаты збор подпісаў супраць гэтага мерапрыемства. Мяркуецца, што новы тур спрэчак за ўладу (у прыватнасьці,

імавернае паніжэньне статусу Аляксандра Мілінкевіча, кіраўніка Палітычнай рады АДС) можа канчаткова расьцерушыць і без таго слабую кааліцыю дэмакратаў.

Між тым лідэр Партыі БНФ Вінцук Вячорка заяўляе, што апазыцыі варта скарэктаваць агітацыйную кампанію і зрабіць акцэнт на тлумачэньні насельніцтву выгадаў ад выкананьня ўладамі 12 пунктаў Эўразьвязу, выкладзеных у ягонай новай стратэгіі ў дачыненньні да Беларусі.

Аднак прадстаўнікі улады (у прыватнасьці, намесьніца кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Натальля Пяткевіч у тэлеэтэры 26 лістапада), а таксама дзяржаўная прапаганда фактычна ўжо адкінулі прапановы Брусэлю. Ва ўладзе сьцьвярджаюць, што яны ёсьць формай дыктату, накіданьня стэрэатыпаў без уліку самабытнасьці беларускай мадэлі, „вуліцай з аднабаковым рухам".

Аналітыкі прагназуюць, што рэжым можа пайсьці сама болей на вызваленьне аднаго ці некалькіх палітвязьняў, каб распачаць з ЭЗ гульню з мэтаю шантажу Крамля.

Разам з тым кіроўная эліта баіцца страты кантролю над сытуацыяй у выпадку, калі будуць распачатыя дэмакратычныя пераўтварэньні.

# АФІЦЫЙНА

## Фармаваньне выбарчых камісіяў завершанае

**29 лістапада ў Беларусі афіцыйна завершыўся працэс фармаваньня ўчастковых выбарчых камісіяў па выбарах дэпутатаў у мясцовыя выбары. — паведамляе БелаПАН.**

Паводле словаў сакратара Цэнтральнай выбарчай камісіі РБ Мікалая Лазавіка, у рэспубліцы павінна працаваць 6.526 выбарчых участкаў.

У Берасьцейскай вобласьці — 992, у Віцебскай — 967, Гомельскай — 1.125, Гарадзенскай — 749, Менскай — 1.128, Магілёўскай — 843 і ў Менску — 667 участкаў.

У параўнаньні зь выбарамі ў мясцовыя саветы 2003 году колькасьць выбарчых участкаў скарацілася на 155.

Як патлумачыў Мікалай Лазавік, гэтая лічба зьяўляецца наступствам аб'яднаньня сельскіх, раённых і гарадзкіх саветаў.

Выбары ў мясцовыя органы ўлады адбудуцца 14 студзеня 2007 году.

# АПАЗЫЦЫЯ

## А. Мілінкевіч у Рызе

**Напярэдадні саміта НАТА у Рызе А.Мілінкевіч правёў шэраг нефармальных сустрэчаў — паведамляецца на сайце belaruspartisan.org.**

На працягу двух бліжэйшых дзён лідэр дэмсілаў будзе працягваць сустракацца з палітыкамі і экспэртамі Эўропы, ЗША і Канады. Ён возьме ўдзел у канфэрэнцыі, падчас якой будзе абмяркоўвацца роля НАТА ў стварэньні сыстэмы сусьветнай бясьпекі й намераваецца выступіць падчас дыскусіі па беларускім пытаньні.

А.Мілінкевіч лічыць, што яго сустрэчы важныя з тае прычыны, што беларуская прапаганда прадстаўляе НАТА як асноўнага ворага Беларусі. А, на думку А.Мілінкевіча, альянс, наадварот, зьяўляецца гарантам бясьпекі, асабліва ў Эўропе.

Беларускія палітыкі павінны падрыхтавацца да супрацоўніцтва з гэтай арганізацыяй, таму асабістыя кантакты неабходна ладзіць як мага часьцей.

"Беларусь — эўрапейская краіна, у яе эўрапейская будучыня. Без такой падрыхтоўкі мы страцім шмат часу тады,

калі станем свабоднай дзяржавай" — сцьвердзіў лідэр дэмсілаў.

А.Мілінкевіч прыехаў у Рыгу па афіцыйным запрашэньні прэзыдэнта Латвіі Вайры Вікэ-Фрэйбэргі. Апроч яго, у сталіцу Латвіі прыбылі праваабаронцы Андрэй Саньнікаў, Ірына Красоўская і Міхаіл Марыніч.

## А. Мілінкевіч сустрэўся з прэзыдэнтам ЗША

**Лідэр беларускай апазыцыі Аляксандар Мілінкевіч сустрэўся з прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам. Сустрэча адбылася падчас саміту NATO ў Рызе. У часе кароткай сустрэчы абмяркоўвалася сытуацыя ў Беларусі, парушэньні правоў чалавека й сытуацыя з палітвязьнямі.**

Таксама Аляксандар Мілінкевіч сустрэўся з былым дарадчыкам прэзыдэнта ЗША па нацыянальнай бясьпецы Зьбігневам Бжэзінскім і прадстаўніком адміністрацыі прэзыдэнта Расеі Сяргеем Караганавым. Аляксандар Мілінкевіч удзельнічае ў саміце NATO па асабістым запрашэньні прэзыдэнта Латвіі Вайры Вікэ-Фрайбэргэ.

## А. Мілінкевіч абвінавачаны ў незаконным перасячэньні мяжы

**Аляксандар Мілінкевіч абвінавачаны ў наўмысным незаконным перасячэньні дзяржаўнай мяжы. Лідэр беларускай апазыцыі быў затрыманы беларускімі памежнікамі ў Нацыянальным аэрапорце "Менск-2", калі ён вяртаўся з саміту NATO ў Рызе.**

Пасьля праверкі дакумэнтаў высьветлілася, што, вылятаючы ў Рыгу некалькі дзён раней, Мілінкевіч памылкова даў памежнікам пашпарт свайго сына — таксама Аляксандра Мілінкевіча. Пашпарт сына выпадкова апынуўся ў адной кішэні зь ягоным. Такім чынам пячатка, якая падцьвярджае выезд за мяжу, была пастаўленая ў пашпарце сына. У сваю чаргу латвійскія памежнікі ў Рызе паставілі пячатку ўжо ў іншы пашпарт, які належыць Мілінкевічу старэйшаму.

Беларускія памежнікі не заўважылі, што пашпарт, у які яны паставілі пячатку, належыць асобе на 25 гадоў маладзейшай, чым асоба, якая перакрочвала мяжу. Да таго ж у гэтым пашпарце адсутнічала латвійская віза.

Адносна Аляксандра Мілінкевіча быў складзены пратакол аб парушэньні артыкулу Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэньнях. Лідэру беларускай апазыцыі пагражае штраф альбо папраўчыя працы тэрмінам да двух месяцаў.

## Акцыя Салідарнасьці ў Менску разагнаная

**Маладым актывістам, якія ўчора мелі намер узяць удзел у акцыі Салідарнасьці зь беларускімі палітзьняволенымі, не ўдалося прайсьці на Кастрычніцкую плошчу сталіцы. Некалькі дзесяткаў "маладафронтаўцаў" былі спыненыя на падыходзе да плошчы як з боку ГУМу, гэтак і з боку Дзяржаўнага цырку.**

Паводле словаў удзельнікаў акцыі, невядомыя людзі ў цывільным вельмі жорстка абыходзіліся з удзельнікамі акцыі, нават скідваючы іх на прыступкі падземнага пераходу ст. мэтро Кастрычніцкая.

Некаторыя сьведкі сцьвярджаюць, што бачылі, як людзі ў цывільным спрабавалі разьбіць камэры прысутным журналістам. Арганізатары акцыі хацелі зьвярнуць увагу лідэраў краінаў - удзельніц СНД на парушэньні правоў чалавека ў Беларусі й на пастаяннае павелічэньне колькасьці палітзьняволеных у краіне.

# ЭКАНОМІКА

## Беларусь і Расея да канца году створаць супольны газавы канцэрн

**"Белтрансгаз" і "Газпром" створаць сумеснае прадпрыемства на парытэтнай аснове. Пра гэта ў аўторак паведаміў прэзыдэнт Расеі Ўладзімір Пуцін. Паводле ягоных словаў, частка цаны на расейскі газ для Беларусі ў 2007 годзе "будзе капіталізавацца ў кошт "Белтрансгазу".**

Апошні разам з "Газпромам" мусяць стварыць "сумеснае прадпрыемства 50 на 50". Ужо сёлета мяркуецца вырашыць "канкрэтныя парамэтры" дамоваў, паведамляе РИА "Новости". Беларускі бок заяву Пуціна пакуль ніяк не камэнтуе.

## Расейскі газ для Беларусі па 200 даляраў!?

**Канцэрн "Газпром" намерваецца прадаваць газ Беларусі па 200 даляраў, Расеі па 49 даляраў, а Эўропе па 293 даляры за тысячу кубаметраў. Такія стаўкі, паводле газеты "Ведомости", прадугледжаныя ў бюджэце канцэрну "Газпром" на 2007 год — інфармуе Хартыя'97.**

У бюджэтным пляне кампаніі паведамляецца, што цана газу для СНД (без Украіны) павінна скласьці прыкладна 210 даляраў за тысячу кубаметраў. У Беларусь "Газпром" зьбіраецца пастаўляць газ па 200 даляраў.

Нагадаем, што вакол цаны расейскага газу ўжо ня першы месяц ідзе гарачая спрэчка. Аляксандар Лукашэнка на пачатку кастрычніка акрэсліў такое павышэньне цаны "адназначна разрывам усіх адносінаў, у эканоміцы — так гэта сапраўды". Тым ня менш, у "Газпроме", здаецца, пытаньне цаны лічаць вырашаным.

## ABN AMRO завершыць ацэнку кампаніі "Белтрансгаз" на пачатку сьнежня

**Галяндзкі банк "ABN AMRO" завершыць незалежную ацэнку беларускай кампаніі "Белтрансгаз" на пачатку сьнежня. Пра гэта паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы, спасылаючыся на крыніцы ва ўрадзе Беларусі.**

Нагадаем, што продажу часткі акцый нацыянальнага апэратара "Белтрансгазу" патрабуе расейскі "Газппром" узамен за нізкія цэны на пастаўляемы ў Беларусь расейскі газ. Спачатку беларускі боку ацэньваў кампанію на 5 млд. даляраў ЗША, хоць нядаўна Аляксандр Лукашэнка заявіў, што канцэрн каштуе да 17 млд. даляраў ЗША. Расейскі бок лічыць цану завышанай, і таму было вырашана вызначыць ацэншчыка "Белтрансгазу", якім стаў галяндзкі банк "ABN AMRO".

## Гандлёвы абмен між Беларусяй і ЭЗ павялічваецца

**Гандлёвы абмен між Беларусяй і краінамі Эўразьвязу цягам першых 9 месяцаў 2006 году павялічыўся на 41% у параўнаньні з аналягічным пэрыядам мінулага году. Пра гэта, як піша [tut.by](tut.by), сьведчаць зьвесткі, прадстаўленыя беларускім Міністэрствам статыстыкі й аналізаў.**

Ад студзеня да верасьня 2006 году гандлёвыя абароты Беларусі дасягнулі больш як 10,5 мільярдаў даляраў. У тым ліку экспарт склаў больш за 7 мільярдаў даляраў, а імпарт — амаль 3,5 мільярдаў даляраў.

Цягам першых 9 месяцаў бягучага году Беларусь праводзіла экспартна-імпартныя апэрацыі са 170 краінамі. Беларускія тавары пастаўляліся ў 138 краінаў. У сваю чаргу на беларускі рынак імпартаваліся тавары са 150 дзяржаваў.

Галоўнымі гандлёвымі партнэрамі Рэспублікі Беларусь у гэты пэрыяд былі : Расея — 47,6% усяго гандлёвага абмену, Галяндыя — 6%, Нямеччына — 5,7%, Украіна — 5,5%, Польшча — 4,3%, Вялікабрытанія — 4,2%, ЗША — 1,7%, Італія — 1,5% і Летува —1,4%.

Агульна беларусы найбольш экспартуюць у Эўразьвяз — 48% беларускіх тавараў, прададзеных за мяжу. Далей Расея - 33,4%, іншыя краіны — 10,2% і астатнія дзяржавы СНГ — 8,4%.

Найбольш Беларусь імпартуе з Расеі — больш за 60,5% агулу тавараў. Імпарт з Эўразьвязу складае больш за 21%.

## Немцы пабудуюць чыгунку празь Беларусь

**Нямецкая чыгунка раскручвае праект хуткаснай дарогі ад Нямеччыны да Кітаю. Грузавыя перавозкі будуць ажыцьцяўляцца ў тым ліку празь Беларусь.**

Плянуецца, што ўвесь шлях зойме дванаццаць дзён — значна менш, чым на караблі. Новая чыгунка будзе спрыяць развіцьцю гандлёвых сувязяў Эўропы з Кітаем, эканоміка якога разьвіваецца імклівымі тэмпамі, а таксама з Усходняй Эўропай. Паводле слоў кіраўніка нямецкай чыгункі Гармута Мэдарна, праект чыгункі мае на мэце рэкордныя паказальнікі. Тавараразварот чакаецца на ўзроўні каля 30 мільёнаў эўра, а прыбытак ад падаткаў — 2 мільёны эўра. Праект пачне рэалізоўвацца ў бліжэйшыя некалькі гадоў, паведамляе "Нямецкая хваля".

## Беларусы не гатовыя паміраць за Расею

**Згодна з паведамленьнем парталу Charter`97, Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў правёў апытаньне сярод беларусаў, датычнае аднаго з апошніх неадназначных выказваньняў прэзыдэнта Лукашэнкі. Ён сказаў, што калі з Захаду танкі пойдуць на Расею, то беларусы павінны быць гатовыя аддаць у змаганьні сваё жыццё.**

Як паказваюць вынікі дасьледваньня НІСЭПД, больш за палову беларусаў (51,4%) не зьбіраюцца паміраць за Расею, 25,9% згадзілася са словамі Лукашэнкі, а 10,8% рэспандэнтаў заявіла, што ім усё роўна.

# ГРАМАДЗТВА

## Коласаўцы вучацца ля Ўроцлава

**У польскай вёсцы Кшыжова ля Ўроцлава (на захадзе Польшчы) пачалася восеньская сэсія для вучняў закрытага беларускімі ўладамі Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа. У інтэрвію агенцтву БелаПАН дырэктар ліцэю Ўладзімер Колас заявіў, што сэсія праходзіць па запрашэньні дабрачыннай фундацыі "Крыжова", якая займаецца культурным супрацоўніцтвам і абменам моладзьдзю.**

Цягам двух бліжэйшых тыдняў заняткі беларускіх ліцэістаў будуць адбывацца ў цэнтры фундацыі — сядзібе вядомага нямецка —польскага арыстакратычнага роду графаў фон Мольткэ - а таксама ў памяшканьнях двух ліцэяў зь мястэчка Сьвідніцэ, якое разьмешчанае ў 30 кілямэтрах ад Ўроцлава.

Падчас прабываньня ў Польшчы, беларускія вучні паедуць на экскурсію ў горы Судэты, пазнаёмяцца з гістарычнымі й культурнымі цікавінкамі Ўроцлава ды прымуць удзел у супольных мерапрыемствах з польскімі ліцэістамі. Паводле дырэктара Ўладзімера Коласа, беларуская моладзь пашырае свае кантакты з польскім грамадзтвам. Напрыклад, днямі дэлегацыя беларускіх ліцэістаў пабывала ў Варшаве на прэм’еры фільма Міраслава Дэмбіньскага пад назовам "Урок беларускай мовы" ды ўдзельнічала ў юбілейным балі Клюбу каталіцкай інтэлігенцыі.

## У Менску адбылася цырымонія ўручэньня кардыналу Казіміру Сьвёнтку адзнакаў Камандора Ордэна Ганаровага Легіёну

**Увечары 23 лістапада ў рэзыдэнцыі Амбасадара Францыі ў Рэспубліцы Беларусь адбылася афіцыйная цырымонія ўручэньня кардыналу Казіміру Сьвёнтку адзнакаў Камандора Ордэна Ганаровага Легіёну.**

Званьне Камандора было нададзена кардыналу Свёнтку прэзыдэнтам Францыі Жакам Шыракам як "чалавеку, які ў вачах францускіх грамадзянаў увасабляе сабой гісторыю беларускага народу апошніх сямідзесяці гадоў".

Падчас урачыстага выступленьня кардынал Казімір Сьвёнтэк сказаў, што прымае ўзнагароду "як сьведчаньне павагі й прызнаньня беларускаму народу й яго лёсу", паведамляецца на сайце catholic.by. Шматгадовы галава каталіцкага касьцёлу ў Беларусі зазначыў, што найважнейшая француская ўзнагарода зьяўляецца ўзнагародай цэламу беларускаму народу, якую атрымлівае "за сваю мужнасць і годнасць, зь якімі ён намагаўся ўчора й імкнецца сёньня выжыць як асобная нацыя".

Паводле кардынала Казіміра Сьвёнтэка, ён "ўдзячны Пану Богу за тое, што даў ласку такога доўгага жыцьця як у добрыя, так і ў дрэнныя дні, сярод гэтага народа, які ніколі мяне не расчароўваў".

## Штамп на выезд для беларусаў будзе адменены ў 2007 годзе

**Штамп аб дазволе на выезд ва ўсе краіны сьвету будзе адмены 30 сьнежня 2007 году. Пра гэта сёньня ў Менску на прэсавай канфэрэнцыі заявіў кіраўнік Дзяржаўнага камітэту памежных войскаў Беларусі генэрал-лейтэнант Аляксандар Паўлоўскі.**

Такое рашэньне было прынятае дзякуючы пазыцыі ўсіх дзяржаўных ведамстваў, якія бралі ўдзел у абмеркаваньні гэтага пытаньня, у тым ліку і Канстытуцыйнага суду.

Адмена штампу будзе магчымай пасьля таго, як большасьць памежных пунктаў пропуску будзе абсталяваная ў адпаведныя аўтаматызаваныя сыстэмы кантролю. На дадзены момант толькі каля 70% памежных пунктаў маюць такое абсталяваньне.
Да канца наступнага году дадзеная сыстэма будзе дзейнічаць на ўсіх памежных кантрольна-прапускных пунктах дзяржавы.

# КУЛЬТУРА

## Юбілей "Нашай Нівы"

**Сёньня найстарэйшая ў гісторыі беларускамоўная газэта "Наша Ніва" адзначае 100 гадавіну свайго заснаваньня, што адбылося ў 1906 годзе ў Вільні — інфармуе IAR.**

Тым часам напярэдадні юбілею беларускае Міністэрства інфармацыі накіравала на адрас газэты афіцыйнае папярэджаньне. Прадстаўнікі міністэрства патлумачылі сваё рашэньне тым, што ў выходных зьвестках газэты за лістапад ня ўказваецца сапраўдны адрас рэдакцыі.

Галоўны рэдактар газэты Андрэй Дынько тлумачыць, што выданьне мае праблемы з атрыманьнем юрыдычнага адрасу. Толькі сёлета рэдакцыя газэты прымушана была пераяжджаць чатыры разы. Кожны раз, калі газэта паведамляла ўладам пра свой новы юрыдычны адрас, уладальнікі рэдакцыйных памяшканьняў дэнансавалі дамову.
Тым часам, Міжнародны ПЭН-Клюб і нідэрляндзкая фундацыя "Oxfam Novib", адзначыла галоўнага рэдактара "Нашай Нівы" прэміяй "Свабода выказваньня". Такім чынам арганізацыі ўшанавалі Андрэя Дынько за ягоныя змаганьні за свабоду слова ў Беларусі.

"Наша Ніва" ужо год не паяўляецца ў беларускіх шапіках. Выданьня ня можна таксама атрымаць шляхам падпіскі. Распаўсюджваньнем беларускамоўнай газэты займаюцца незалежныя арганізацыі. "Нашу Ніву" можна чытаць таксама ў інтэрнэце.

## 80-годзьдзе Драматычнага тэатру імя Я. Коласа

**Прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка павіншаваў калектыў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатру імя Якуба Коласа з 80-годзьдзем ягонай дзейнасьці — паведамляе БЕЛТА.**

"Ваш калектыў працягвае пастаянныя мастацкія пошукі: клапоціцца пра традыцыю й адначасова застаецца адкрытым на сьмелыя экспэрымэнты, па-мастацку асвойваючы спадчыну ўсясьветнага тэатру", — чытаем у заяве беларускага прэзыдэнта.

Аляксандар Лукашэнка пажадаў чальцом калектыву тэатру далейшай творчай працы й посьпехаў ва ўзрушваньні гледачоў сваім майстэрствам, а таксама плённай працы на карысьць роднай Беларусі.

## Беларуска-польская выстава ў Горадні

**У Горадні ў Новым каралеўскім замку дзейнічае супольная беларуска-польская архэалягічная выстава — паведамляе карэспаднэнт Радыё Свабода.**

Выстава "Каштоўнасьці пяці тысячагодзьдзяў: архэалягічная спадчына Падляшша й Гарадзеншчыны" фінансуецца са сродкаў з праграмы TACIS.

Наведвальнікі могуць убачыць, напрыклад, каменныя сякеры, старажытныя бранзалеты ці кафлю з магнацкімі гербамі.

Кіраўнік аддзелу архэалёгіі Гарадзенскага гісторыка-археалягічнага музэю Натальля Кізюкевіч нагадае, што з траўня да канца кастрычніка згаданую выставу можна было ўбачыць у Музэі Падляшша ў Беластоку.

"Зараз яна прыехала сюды, толькі ўжо ў крыху іншым выглядзе. (...)Тут больш нашых экспанатаў — больш за 600 прадметаў з нашага Гарадзенскага гісторыка-археалягічнага музэю і 121 прадмет з музэю Падляшша ў Беластоку.

Сярод гэтых польскіх прадметаў выдатнейшая калекцыя балцкай керамікі. І самымі прыгожымі экспанатамі, якія прывезьлі да нас польскія калегі, можна, канешне, лічыць мэталічныя аздобы й зброю," — тлумачыць Натальля Кізюкевіч.

З мэтай наладжаньня двухбаковага супрацоўніцтва, у тым ліку наладжаньня выставы й археалягічных раскопак Эўразьвяз прызначыў адмысловы грант. У сваю чаргу беластоцкія экспанаты ў Горадню прывезьлі дзякуючы падтрымцы польскага Міністэрства культуры.

## У Менску адчыніцца новы будынак Нацыянальнага музэю

**У сьнежні ў Менску адчыніцца новы будынак Нацыянальнага мастацкага музэю. Цырымоніі адкрыцьця новага чатырохпавярховага будынку будуць адбывацца пачынаючы ад 5 сьнежня й працягнуцца некалькі дзён.**

У сьвяточным адкрыцьці новага будынку возьмуць удзел кіраўнікі найбуйнейшых музэяў краіны, а таксама беларускія мастакі. Пазьней адбудзецца прэзэнтацыя будынку для дыпляматаў і прадстаўнікоў творчых зьвязаў краіны.

9 сьнежня новы будынак Нацыянальнага музэю прыме сваіх першых наведвальнікаў.

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейска моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, нямецкай, французскай, беларускай, расейскай ды ўкраінскай мовах можна замовіць на сайце.